ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 34 (1101) | Чацвер, 16 жніўня 1956 года | Цана 40 кап.

13 жніўня на 74-м годзе жыцця памер вялікі сын беларускага народа, выдатны яго пясняр, вучоны і грамадскі дзеяч ЯКУБ КОЛАС.

Яго светлае імя будзе вечна жыць у сэрцы народа.

АД ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КПБ, СОВЕТА МІНІСТРАЎ БССР І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

Цэнтральны Камітэт КПБ, Совет Міністраў БССР і Прэзідыум Вярхоўнага Совета Беларускай ССР з глыбокім жалем паведамляюць, што 13 жніўня 1956 года на 74-м годзе жыцця памёр **Якуб Колас** (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч), член ЦК КПБ, дэпутат Вярхоўнага Совета СССР і Вярхоўнага Совета БССР, член Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР, віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук БССР, народны паэт Беларускай ССР.

Цэнтральны Камітэт КП Беларусі | **Совет Міністраў Беларускай ССР** | **Прэзідыум Вярхоўнага Совета БССР**

Ад Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР

Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР з глыбокім жалем паведамляе, што 13 жніўня г. г. на 74 годзе жыцця памёр таварыш **Якуб Колас** (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч) — дэпутат Вярхоўнага Совета СССР, выдатны совецкі пісьменнік, народны паэт Беларусі, віцэ-прэзідэнт Беларускай Акадэміі навук, член Праўлення Саюза пісьменнікаў СССР.

Ад Саюза пісьменнікаў БССР

Саюз пісьменнікаў БССР з глыбокім смуткам паведамляе аб смерці члена Прэзідыума праўлення Саюза пісьменнікаў БССР, народнага паэта **Якуба Коласа** (Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча) і выказвае спачуванне сям'і памёршага.

Прэзідыум праўлення Саюза пісьменнікаў БССР.

Ад Міністэрства культуры БССР

Міністэрства культуры БССР глыбока смуткуе з прычыны смерці выдатнага дзеяча совецкай культуры, народнага паэта Беларусі **Якуба Коласа** (Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча) і выказвае спачуванне сям'і памёршага.

Ад Прэзідыума Акадэміі навук БССР

Прэзідыум Акадэміі навук Беларускай ССР з глыбокім жалем паведамляе аб смерці выдатнага вучонага, народнага паэта Беларусі, старэйшага акадэміка АН БССР, віцэ-прэзідэнта АН БССР **Якуба Коласа** (Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча), якая паследавала 13 жніўня г. г. на 74-м годзе жыцця, і выказвае спачуванне сям'і памёршага.

Ад Праўлення Саюза пісьменнікаў СССР

Праўленне Саюза пісьменнікаў СССР з глыбокім жалем паведамляе аб смерці выдатнага совецкага пісьменніка, народнага паэта Беларусі, члена Праўлення Саюза пісьменнікаў СССР **Якуба Коласа** (Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча), якая паследавала 13 жніўня 1956 года, і выказвае сваё спачуванне сям'і памёршага пісьменніка.

Ад Беларускага рэспубліканскага камітэта абароны міру

Беларускі рэспубліканскі камітэт абароны міру з глыбокім смуткам паведамляе аб смерці старшыні Беларускага камітэта абароны міру, палымянага барацьбіта за мір ва ўсім свеце — **Якуба Коласа** і выказвае спачуванне сям'і памёршага.

Прэзідыум Беларускага рэспубліканскага камітэта абароны міру.

Ад Цэнтральнага камітэта ЛКСМ Беларусі

Цэнтральны Камітэт ЛКСМ Беларусі з глыбокім смуткам паведамляе комсамольцам і моладзі рэспублікі, што 13 жніўня 1956 года на 74-м годзе жыцця памёр член Цэнтральнага Камітэта КП Беларусі, дэпутат Вярхоўнага Совета СССР і Вярхоўнага Совета БССР, член Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР, віцэ-прэзідэнт АН БССР, народны паэт Беларускай ССР **Якуб Колас** (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч).

Цэнтральны Камітэт ЛКСМ Беларусі.

Ад Беларускага рэспубліканскага Совета профсаюзаў

Беларускі рэспубліканскі Совет профсаюзаў глыбока смуткуе ў сувязі з раптоўнай смерцю народнага паэта Беларусі **Якуба Коласа** (Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча) і выказвае спачуванне сям'і памёршага.

Беларускі рэспубліканскі Совет профсаюзаў.

Памяці Якуба Коласа

Цяжкую ўтрату панёс беларускі народ. 13 жніўня на 74-м годзе жыцця памёр народны паэт Беларусі, член Цэнтральнага Камітэта КПБ, дэпутат Вярхоўнага Совета СССР і Вярхоўнага Совета БССР, член Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР, віцэ-прэзідэнт Акадэміі навук БССР, член прэзідыума праўлення Саюза пісьменнікаў СССР і БССР, старшыня Рэспубліканскага камітэта абароны міру Якуб Колас (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч).

Смерць вырвала з нашых радоў аднаго з лепшых сыноў беларускага народа, буйнейшага пісьменніка і выдатнага грамадскага дзеяча.

Усё сваё жыццё, усе свае сілы, вялікі талент мастака слова Якуб Колас аддаў справе працоўнага народа. Сын селяніна-бедняка, Канстанцін Міхайлавіч з ранніх год спазнаў галечу і бяспраўе працоўнага чалавека, прыгнечанага памешчыкамі і капіталістамі. У яго юнацкай душы абудзіўся гарачы пратэст супраць соцыяльнага і нацыянальнага прыгнёту. Ужо ў першыя гады сваёй грамадскай і літаратурнай дзейнасці ён выступае як актыўны змагар за лепшую долю народа. Ні праследаванне паліцыі, ні царскі суд, ні турмы не зламалі волю Якуба Коласа, не пахіснулі яго веры ў сілу народа. З турэмнага зняволення ён смела заяўляў:

«Я мужык, а гонар маю,
Гнуся, але да пары.
Я маўчу, маўчу, трываю,
Але скора загукаю:
«Стрэльбы, хлопчыкі, бяры!»

Уступіўшы на літаратурную арэну ў бурныя гады першай рускай рэволюцыі, Якуб Колас неўзабаве заваёўвае прызнанне і любоў шырокіх працоўных мас. Высокую ацэнку творчасць маладога Коласа атрымала з вуснаў вялікага рускага пісьменніка Максіма Горкага.

За 50 год сваёй літаратурнай дзейнасці Якуб Колас напісаў шмат выдатных твораў. Сярод іх такія выдатныя творы, як паэма «Новая зямля», «Сымон-музыка», «Рыбакова хата», аповесць «Дрыгва», трылогія «На ростанях» і інш. Гэтыя творы ўвайшлі ў скарбніцу совецкай літаратуры і сталі любімымі кнігамі мільёнаў совецкіх людзей. Яны шырока вядомы і чытачам зарубежных краін. У высокамастацкіх творах Якуба Коласа знайшлі глыбокае адлюстраванне важныя падзеі ў жыцці беларускага народа, у яго барацьбе за светлую будучыню нашай Радзімы.

У дні Вялікай Айчыннай вайны палымянае слова народнага паэта натхняла воінаў Совецкай Арміі і партызан на гераічную барацьбу супраць гітлераўскіх захопнікаў.

Сваю плённую літаратурную дзейнасць Якуб Колас заўсёды спалучаў з актыўнай грамадскай і навуковай работай. З'яўляючыся членам Цэнтральнага Камітэта КП Беларусі, дэпутатам Вярхоўнага Совета СССР і Вярхоўнага Совета БССР, Канстанцін Міхайлавіч прымаў актыўны ўдзел у вырашэнні вялікіх і складаных задач гаспадарчага і культурнага будаўніцтва нашай краіны. Якуб Колас заўсёды праяўляў вялікія бацькоўскія клопаты аб выхаванні маладых совецкіх пісьменнікаў.

Якуб Колас прымаў удзел у рабоце XX з'езду КПСС у якасці яго дэлегата ад Камуністычнай партыі Беларусі.

За выдатныя заслугі перад Радзімай Якуб Колас узнагароджаны пяццю ордэнамі Леніна, ордэнам Чырвонага Сцяга, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі.

Светлае імя выдатнага сына беларускага народа Якуба Коласа, палымянага патрыёта Совецкай Радзімы, вялікага мастака, заўсёды будзе жыць у нашых сэрцах.

Вечная памяць табе, наш дарагі друг і таварыш.

Абрасімаў П. А., Аўхімовіч Н. Я., Аксёнаў А. Н., Азгур З. І., Александроўская Л. П., Баскакаў М. І., Бельскі І. А., Броўка П. У., Бембель А. О., Варвашэня І. Д., Уладамірскі У. О., Гарбуноў Ц. С., Глебка П. Ф., Глебаў Г. П., Глебаў А. К., Ерафееў Б. В., Ільюшын І. М., Ільінскі А. К., Кісялёў Ц. Я., Кісялёў К. В., Кісялёў Г. Я., Клімаў І. Ф., Казлоў В. І., Крапіва К. К., Купрэвіч В. Ф., Куляшоў А. А., Красоўскі Н. І., Лынькоў М. Ц., Лупіновіч І. С., Лукашоў К. І., Луцэвіч В. Ф., Мазураў К. Т., Макараў І. Н., Малінін С. Н., Мацэпура М. Е., Маўр Янка, Малчанаў П. С., Новікава Ф. А., Новікава Т. І., Арлоўскі К. П., Патолічаў Н. С., Прытыцкі С. О., Панчанка П. Е., Платонаў Б. В., Перцаў В. Н., Раўнаполец С. М., Сурганаў Ф. А., Цімашэнка С. К., Танк Максім, Цікоцкі Я. К., Уралава Е. І., Ржэцкая Л. І., Шарапаў В. І., Шамякін І. П., Шырма Г. Р., Шаура В. Ф., Халіпаў Н. А.

НАСТАЎНІК І ДРУГ

Перастала біцца гарачае сэрца народнага паэта Якуба Коласа.

Якуб Колас — вялікі сын беларускага народа. Яму ўласцівы ўсе лепшыя якасці народа: яго свабодалюбнасць, працавітасць, розум, мужнасць і талент.

Яшчэ ў маладыя гады Якуб Колас звязаў свой лёс з вызваленчай барацьбой працоўных. Змаганню за свабоднае, шчаслівае жыццё народа аддаў ён свой вялікі талент мастака, страсць грамадзяніна, усяго сябе, да апошняга дыхання. Праца яго, тварэнні яго — агромністыя, і таму такая невымерная наша ўтрата — яго дачасная смерць. Сын беззямельнага селяніна, Якуб Колас добра ведаў боль крывавага падняволнага мазаля і таму глыбока паважаў працу і любіў чалавека працы. Гэтая ясная і празрыстая любоў жыве ў яго творах, — незабыўныя карціны працы, мужныя постаці духоўна прыгожых людзей пакінуў ён нам у навуку і як узор на доўгія гады для многіх пакаленняў. Творчасць Якуба Коласа — тая чыстая крыніца, адкуль мы чэрпаем любоў да Радзімы, гнеў супраць яе ворагаў, адчуванне нацыянальнай годнасці.

З гнеўным запалам выступаў Якуб Колас у дарэволюцыйныя часы супраць прыгнечання і заняволення чалавека; з вялікай любасцю і шчырасцю апяваў ён жыццё сваёй свабоднай краіны, яе поступ наперад да велічнай мэты — комунізма.

Якуб Колас — высокі прыклад патрыёта, комуніста, для каго шчасце народа з'яўляецца яго асабістым шчасцем.

Разам са сваім вялікім сябрам Янкам Купалам Якуб Колас, поўны замілавання да роднага слова, ствараў такія здабыткі нацыянальнай літаратуры, якія сталі блізкімі і роднымі ўсяму перадавому чалавецтву.

Якуб Колас — вястун нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа, які пасля Вялікага Кастрычніка здабыў сабе дзяржаўнасць і ў братняй сям'і народаў Совецкага Саюза выкоўвае шчаслівую будучыню.

Беларускія пісьменнікі схіляюць галовы перад труною свайго любімага настаўніка і шчырага друга. І хоць глыбокі смутак агортвае нашы сэрцы, мы поўны непахіснай волі шырыць гуманістычныя запаветы народнага паэта, працаваць з яго сумленнасцю і адданасцю для шчасця народа пад сцягам вялікіх ідэй Комуністычнай партыі.

Якуб Колас бязмежна любіў людзей і сам быў агорнуты жыццедзейнай цеплынёй народнай любві. Гэтая любоў давала яму сілу, веру, натхняла яго на творчы подзвіг. Такое жыццё вечнае, як вечнае жыццё народа.

М. Аўрамчык, А. Астрэйка, Э. Агняцвет, А. Александровіч, П. Броўка, Я. Брыль, А. Бялевіч, В. Бурносаў, В. Барысенка, Г. Бярозкін, К. Буйла, А. Бачыла, М. Барсток, М. Васілёк, В. Вольскі, Э. Валасевіч, В. Вітка, А. Вялюгін, Я. Васілёнак, П. Глебка, Н. Гарулёў, І. Грамовіч, І. Гурскі, К. Губарэвіч, М. Гамолка, І. Гутараў, С. Дзяргай, А. Есакоў, Я. Журба, М. Засім, А. Зарыцкі, А. Звонак, В. Зуб, В. Івашын, К. Крапіва, А. Куляшоў, А. Кучар, У. Краўчанка, П. Кавалёў, Д. Кавалёў, У. Корбан, К. Кірэенка, М. Калачынскі, У. Карпаў, А. Кулакоўскі, І. Кудраўцаў, І. Казека, М. Лынькоў, М. Ларчанка, М. Лужанін, Я. Маўр, М. Машара, І. Мележ, А. Міронаў, С. Майхровіч, А. Маўзон, А. Макаёнак, Р. Няхай, А. Пальчэўскі, П. Пестрак, П. Прыходзька, В. Палескі, П. Панчанка, Н. Перкін, М. Паслядовіч, Ю. Пшыркоў, Д. Палітыка, А. Пысін, П. Прануза, Я. Рамановіч, А. Русак, А. Русецкі, А. Рылько, А. Семяновіч, Р. Сабаленка, Я. Скрыган, Я. Сяміжонаў, М. Садковіч, М. Танк, Н. Тарас, М. Ткачоў, М. Татур, М. Хведаровіч, Т. Хадкевіч, І. Шамякін, Я. Шарахоўскі, У. Шахавец, Г. Шчарбатаў, У. Юрэвіч, А. Якімовіч.

Наш пясняр

Цяжкі смутак і глыбокі боль напаўняюць сэрца ад усведамлення таго, што няма больш з намі Якуба Коласа, палымянага барацьбіта, выдатнага паэта, песняра беларускага народа, які стварыў неўміручыя вобразы, што ўслаўляюць свой народ, сваю Радзіму. Гэтае дарагое імя сваім цудоўным талентам заўсёды саграваала кожнага і ў цяжкія хвіліны, і ў часы радасці. Паэзія народнага песняра падобная вечнай крыніцы, крышталёваму струменю, да якога звяртаецца кожны, каб набрацца сілы і ўпэўненасці, разбудзіць у сабе светлае натхненне.

Жыватворчае слова паэта — вялікага грамадзяніна, падобна веснавому сонцу, якое дае жыццё, натхняе лепшымі пачуццямі, думкамі і летуценнямі. Яно нязгаснае і заўсёды вечнае, як і само жыццё. Гарачы патрыёт, барацьбіт за чалавечую праўду і сумленне, за светлую комуністычную будучыню, за шчасце свайго народа, Якуб Колас застаецца вечна жывым, самым дарагім і блізкім мастаком нашай сучаснасці.

Створаныя вялікім паэтам цудоўныя вобразы служаць найлепшым прыкладам сапраўднага, заўсёды маладога мастацтва, з'яўляюцца ўзорам адданасці пісьменніка свайму абавязку перад Радзімай.

Перастала біцца сэрца народнага песняра, творчасць якога вельмі значная для беларускай літаратуры і ў такой-жа ступені для ўсяго нашага мастацтва.

Творчасць Коласа блізкая і дарагая кожнаму мастаку—жывапісцу, скульптару, графіку, якія заўсёды натхняюцца паэтычнымі вобразамі пісьменніка, вучацца ў яго разумець жыццё, пранікнёна і глыбока любіць сваю вялікую Радзіму.

Лепшы друг совецкіх мастакоў — Якуб Колас, узбагаціўшы сваімі творамі скарбніцу айчыннага мастацтва, застанецца ў сэрцы кожнага совецкага чалавека вечна жывым народным песняром.

З. Азгур, Е. Аладава, І. Ахрэмчык, А. Бембель, В. Волкаў, П. Гаўрыленка, П. Герасімовіч, А. Глебаў, Н. Гусеў, І. Давідовіч, Я. Зайцаў, В. Ждан, Б. Звінагродскі, Я. Красоўскі, В. Кудрэвіч, С. Лі, О. Марыкс, Б. Малкін, Я. Нікалаеў, З. Паўлоўскі, С. Селіханаў, І. Ушакоў, А. Шыбнёў, В. Цвірка.

Ад Мінскага гарадскога камітэта КПБ і выканкома Мінскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных

Мінскі гарадскі Камітэт КПБ і выканком Мінскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных выказваюць глыбокае спачуванне з прычыны смерці народнага паэта БССР, дэпутата Вярхоўнага Совета СССР і Вярхоўнага Совета БССР, члена ЦК КПБ Канстанціна Міхайлавіча **Міцкевіча** — Якуба Коласа.

Мінскі гарком КПБ.
Выканком Мінскага гарадскога Совета дэпутатаў працоўных.

Медыцынскае заключэнне аб хваробе і прычыне смерці народнага паэта Беларусі таварыша Якуба Коласа (Міцкевіча Канстанціна Міхайлавіча)

Якуб Колас (Міцкевіч Канстанцін Міхайлавіч) 74 год, на працягу многіх год хварэў цяжкай формай гіпертанічнай хваробы і агульным атэрасклерозам.

Смерць наступіла раптоўна 13 жніўня 1956 года ў 13 гадзін 20 мінут ад вострай сасудзіста-сардэчнай недастатковасці.

Нам, міністра аховы здароўя БССР М. М. ТУР.
Начальнік лячэбна-санітарнага ўпраўлення Міністэрства аховы здароўя БССР праф. А. Д. АДЭНСКІ.
Заслужаны дзеяч навукі, член-карэспандэнт Акадэміі навук БССР праф. Б. І. ТРУСЕВІЧ.
Галоўны хірург Міністэрства аховы здароўя БССР І. А. КАЖАНКОЎ.
Лечачы ўрач, заслужаны ўрач БССР С. І. ЛІЯРАНЦЭВІЧ.
Прафесар патолага-анатам Ю. В. ГУЛЬКЕВІЧ.

ЯКУБ КОЛАС

Бывай, наш Колас

У чорным крэпе колер лета.
Павольна гасне жніўня дзень.
Народ-жа да свайго паэта
Усё ідзе, ідзе, ідзе.

Зямлі радзімай чуцен голас.
Нібыта кажа сам абшар:
Бывай, наш друг,
Наш бацька Колас,
Народа нашага пясняр.

Пятро ПРЫХОДЗЬКА.

Ля труны паэта

Схіляючы галовы свае ў скрусе,
Праходзяць несупынна ля труны
Сыны і дочкі роднай Беларусі —
Апошні раз паклон аддаць зямны.

Стаяць сябры на варце ганаровай.
Вянкі праносяць.
І на нейкі міг
Чуваць у зале шум лясоў хваёвых
І свежы водзір кветак палявых.

Не, не вянкі жалобныя наўкола —
Зямля, што Вас узгадавала, Колас,
І матчыным ўспаіла малаком, —
Не ў чорным крэпе,
а ў агнях вясёлак
Ляжыць жывым, квітнеючым вянком.

Сцяпан ГАЎРУСЕЎ.

Пам'яті Якуба Коласа

Замовк співець, але звучати слову,
Що з серця злинуло з життям вести
розмову.

У вічному народнім хорі голос
Я чую знову—то говорить Колас.

Брати і друзі білоруси в сумі,
І я із вами у важкій задумі,
Ділити горе в ці важкі години
До вас приїхав з рідної України.

Прощай, співець—ми тихо промовляем,
Та всі одну, єдину віру маем,
Що вік тобі в любові жить між нами,
Між нами і майбутніми синами.

Прощай, співець, народу славний сине,
Хороший друг моєї України.

Олекса ЮЩЕНКО

НАШ ВЯНОК

Каля труны яго за гэтыя два дні прайшлі сотні і тысячы людзей. На апошнім яго шляху — ад Палаца культуры да магілы ў засені родных бяроз і сасонак — хваляваўся бясконцы паток людзей. І гэта была толькі маленькая частка тых, хто хацеў-бы апошні раз паглядзець на Коласа, прайсці за труной свайго — народнага — паэта.

Цяжка было гаварыць, бо нават, здаецца, у самой урачыстай яснасці гэтых жніўневых дзён, у паветры стаялі словы **цяжкая ўтрата...** Гледзячы на смутак і слёзы ў вачах такога мноства людзей, цяжка было знайсці нейкія толькі свае, нейкія новыя словы, якімі можна перадаць свае пачуцці.

Можа ніколі мы не адчувалі так моцна, так глыбока значэнне слоў — народны паэт; можа ніколі не было так радасна і так страшна адчуваць сябе пісьменнікам...

У гэтыя дні не раз успаміналіся словы Чэхава: «Калі ў літаратуры ёсць Талстой — лёгка і прыемна быць літаратарам...» Якуб Колас — вялікі мастак і нястомны працаўнік—да апошніх дзён сваіх нёс такую частку нашай агульнай ношы, што цяпер, калі яна перадалася на плечы яго наступнікаў, мы адчуваем пасапраўднаму, як шмат рабіў гэты адзін чалавек і як нялёгка будзе нам — хоць-бы і ўсім калектывам — трымаць беларускую літаратуру на коласаўскім узроўні.

Так, без Коласа, адчуўшы разам з народам усю горыч цяжкае ўтраты, мы, хто застаўся на пасту, усведамляем з усёй адказнасцю, што мы павінны цяпер падвоіць свае намаганні ў барацьбе за якасць мастацкага слова.

Гэтага патрабуе ад нас народ, які так моцна палюбіў за шчырую службу свайго вялікага сына. Гэта — найлепшы, з жывых, невянучых кветак вянок да помніка нашага мудрага настаўніка і незабыўнага друга.

Янка БРЫЛЬ.

Настаўнік

У дзяцінстве маім ёсць адна вельмі яркая дата. Недзе ў пачатку дваццатых гадоў, у Слуцку, на Манастыршчыне, на беразе Случы я сустрэў яшчэ маладога чалавека, з невялікімі вусікамі, здаецца ў саламяным капелюшы, з чорным пакамечаным партфелем. Гэта быў Якуб Колас, што прыязджаў на настаўніцкую канферэнцыю.

Да таго часу я ведаў Якуба Коласа і Тараса Гушчу толькі па кнігах, якія купляў як мог і дзе толькі мог: у крамах, у знаёмых хлопцаў, а найбольш нават не ведаючы ў каго — напытваў у перакупшчыкаў. Гэта былі, часамі, ужо вельмі зачытаныя кнігі: з пазаклейванымі лістамі, з выцертай вокладкай, і таму яшчэ больш дарагія. Звычайна ў іх пісалася пра беднага, гаротнага чалавека і пра пошукі чалавечага шчасця. І найбольшай асалодай і ўцехай было, прыдбаўшы такую кніжку, чытаць не цэлыя ночы, па некалькі разоў — без канца. Які харошы, шырокі, прывабны і поўны хваляванняў свет раскрывалі тыя кніжкі — простыя, напісаныя моваю, самаю блізкаю сэрцу.

І можа ад тых кніжак я сам злажыўся пісаць...

За тыя светлыя часы дзяцінства ад Вашых кніжак, за чалавечае фармаванне душы Вашым словам — шчырае, сардэчнае дзякуй, дарагі і любы настаўнік.

Вы для нас не памерлі, дзядзька Якуб. Мы будзем вучыцца ў Вас і надалей — і працы, і сумленню, і высокай чалавечай годнасці.

Янка СКРЫГАН.

Песня не памірае

Цяжкая вестка прышла на завод у той-жа дзень. І адразу сталі сумнымі твары маіх таварышаў па рабоце — слесара Яўгенія Гудзяна, расточніка Мікалая Чычко. Я разумеў гэты сум. Ім, як і мне, дорага ўсё тое, што было створана народным паэтам за ўсё яго творчае жыццё.

Якуб Колас заўсёды захапляўся велічу нашага будаўніцтва, у кожным новым заводзе бачыў новую магутнасць Беларусі. Аб гэтым ён з гонарам пісаў у сваіх вершах і паэмах. Вось чаму, калі я бяру ў рукі томік твораў народнага паэта, мяне хвалююць пранікнёныя радкі, прысвечаныя мне, простаму рабочаму.

Калі я стаяў ля труны паэта, я думаў аб тым, што не можа памерці песня. Усё тое, што стварыў Якуб Колас, будзе жыць у нашых сэрцах таксама, як і памяць аб любімым песняру.

А. ЕУЦЮКОЎ,
строгальшчык трактарнага завода.

Жалобнае развітанне

Жалобныя сцягі звісаюць над уваходам у Палац культуры профсаюзаў—адзін з прыгажэйшых будынкаў новага Мінска. Па Цэнтральнай плошчы цячэ бясконцы людскі струмень, уліваючыся ў расчыненыя дзверы Палаца. Вестка аб смерці Якуба Коласа ўскалыхнула беларускую сталіцу, глыбокім смуткам і болем азвалася ў сэрцах мінчан, як і ў сэрцы ўсяго беларускага народа.

Як толькі труна з целам нябожчыка была ўстаноўлена ў Палацы культуры, да яго пацягнуліся тысячы і тысячы людзей, каб аддаць апошнюю пашану любімаму мастаку слова, народнаму песняру, выдатнаму грамадскаму і дзяржаўнаму дзеячу. Старыя, моладзь, дзетвара, рабочыя і служачыя, студэнты і школьнікі, вайскоўцы і калгаснікі—прадстаўнікі розных пакаленняў прышлі сюды схіліць галовы ў жалобе.

Мы ўваходзім у Палац, углядаемся ў знаёмыя і бясконца дарагія кожнаму з нас рысы твара памёршага, і наша свядомасць не можа змірыцца з цяжарам утраты. Яшчэ ўчора білася і гарэла творчым агнём неспакойнае сэрца гэтага вялікага чалавека, і пальцы рукі, якая ўсё жыццё не ведала стомы, трымалі пяро. Няўмольная смерць застала яго за рабочым сталом.

Ля высокага пастамента, на якім устаноўлена труна, расце і расце гара вянкоў з зелені і жывых кветак. Вянкі—ад Цэнтральнага Камітэта КП Беларусі, ад Прэзідыума Вярхоўнага Совета і Совета Міністраў БССР, ад устаноў і арганізацый, ад калектываў прадпрыемстваў і будоўляў, ад асобных людзей. Гарачыя словы павагі і любві да нябожчыка напісаны на істужках вянкоў.

Палац поўніцца гукамі жалобных мелодый. Ля труны змяняецца ганаровая варта, якую нясуць прадстаўнікі партыйных, совецкіх і профсаюзных арганізацый, прадпрыемстваў і ўстаноў, пісьменнікі, вучоныя, артысты, мастакі. У ганаровай варце мы бачым кіраўнікоў партыі і ўрада Беларусі, многіх выдатных людзей рэспублікі, якія спецыяльна прыехалі ў Мінск, пачуўшы вестку аб смерці Якуба Коласа.

А міма труны льецца і льецца людскі струмень, і на твары кожнага — ці гэта стары кадравы рабочы, ці юнак-студэнт, ці бабулька, ці хлопчык з піонерскім гальштукам, ці калгаснік, які завітаў сюды з далёкага Палесся, радзімы славутага дзеда Талаша—смутак і жальба.

Любоў народа да свайго вялікага сына невычарпальная. Ён заслужыў яе, гэтую бясконцую любоў, аддаўшы свой магутны талент, сваё сэрца і розум народу.

Паплечнік незабыўнага Янкі Купалы, Якуб Колас пяцьдзесят год таму назад надрукаваў свой першы верш. З таго часу

Ля будынка Палаца культуры профсаюзаў у дні развітання з паэтам.

не сціхаў яго голас і ў змрочныя гады царызма, калі ён клікаў працоўных на барацьбу супраць соцыяльнага і нацыянальнага прыгнёту, і ў гады рэволюцыі, калі ён славіў доўгачаканую волю і клікаў да светлай будучыні, і ў гады мірнага соцыялістычнага будаўніцтва, і ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Да апошняй хвіліны ён нястомна працаваў, папаўняючы скарбніцу беларускай літаратуры і ўзвялічваючы яе.

Прышоўшы ў дзяцінстве ў школу, мы па творах Якуба Коласа вучыліся любіць Радзіму, працу, справядлівасць і ненавідзець усё шкоднае, што перашкаджае ісці да высокароднай, светлай мэты, якая вызначана партыяй. Юнакамі мы сустракалі кожнае новае слова паэта як вялікую радасць. І цяпер, у сталым узросце, перачытваючы яго кнігі, мы захапляемся прыгажосцю мастацкага слова, цудоўным гучаннем роднай мовы і глыбокай народнай мудрасцю, укладзенай у кожны радок.

Вышаўшы з народных глыбінь, увабраўшы ў сябе думы і спадзяванні шырокіх народных мас, Якуб Колас стаў душой і сумленнем свайго народа.

Творчы шлях Якуба Коласа—гэта эпоха ў развіцці беларускай літаратуры, эпоха яе няспыннага росту і росквіту. З яго імем і клопатамі звязаны прыход у літаратуру цэлай плеяды пісьменнікаў малодшых пакаленняў, выхад беларускай літаратуры на ўсесаюзную арэну і за межы Совецкага Саюза.

Нястомны працаўнік, талент незвычайнага размаху, пісьменнік і вучоны, грамадскі і дзяржаўны дзеяч—такім ён быў і назаўсёды застанецца ў нашай памяці.

Таму так людна на Цэнтральнай плошчы ля Палаца культуры, таму столькі народу прышло прыняць удзел у пахаванні. За два дні, у якія быў адкрыты доступ да цела памёршага, каля яго труны прайшло больш 150 тысяч чалавек.

... Машына з труной паволі рухаецца па праспекту ў кірунку могілак. Тысячы і тысячы мінчан, што ідуць за машынай і стаяць уздоўж праспекта, на балконах і дахах будынкаў, пасылаюць вялікаму песняру беларускага народа апошняе «Бывай!»

Тарас ХАДКЕВІЧ.

УЗОР СЛУЖЭННЯ НАРОДУ

Памёр Якуб Колас. Перастала біцца сэрца вялікага сына беларускага народа. Цяжка нават падумаць, што больш мы не пачуем яго бацькоўскую параду, сяброўскую заўвагу, ласкавае бадзёрае слова, дасціпны жарт, не ўбачым яго жывы пранікнёны пагляд.

Якуб Колас—увасабленне прыгажосці і чароўнасці краіны, у якой ён нарадзіўся, велічы і таленавітасці народа, што выпеставаў яго светлы, магутны геній.

Нявымернае наша гора. Але ў гадзіну глыбокага смутку нас суцяшае адно: смерць безуладна над народным песняром. Імя Якуба Коласа будзе заўсёды натхняць нас у самаадданым служэнні народу і Радзіме.

Бывай, наш звонкі баяне, наш клапатлівы бацька і мудры настаўнік, наш верны і незабыўны друг!

Юліян ПШЫРКОЎ.



На працягу двух дзён не спыняўся паток працоўных, якія ішлі ў Палац культуры профсаюзаў развітацца са сваім любімым паэтам.

Ад Беларускага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы

Калектыў работнікаў Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы глыбока смуткуе з прычыны смерці народнага паэта БССР **Якуба Коласа** і выказвае спачуванне сям'і памёршага.

Ад Беларускага дзяржаўнага тэатра імя Якуба Коласа

Разам з усім совецкім народам калектыў тэатра імя Якуба Коласа глыбока смуткуе з прычыны цяжкай утраты — смерці вялікага сына беларускага народа, любімага народнага паэта **Якуба Коласа** і выказвае глыбокае спачуванне сям'і памёршага.

Ад Дзяржаўнага выдавецтва БССР

Супрацоўнікі Дзяржаўнага выдавецтва БССР глыбока смуткуюць з прычыны смерці выдатнага дзеяча беларускай совецкай літаратуры, народнага паэта БССР **Якуба Коласа** (Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча) і выказваюць глыбокае спачуванне яго сям'і.

Ад Інстытута літаратуры і мастацтва Акадэміі навук БССР

Дырэкцыя і калектыў навуковых супрацоўнікаў Інстытута літаратуры і мастацтва Акадэміі навук БССР глыбока смуткуюць з прычыны заўчаснай смерці выдатнага дзеяча совецкай літаратуры, народнага паэта БССР, акадэміка **Якуба Коласа**, якая паследавала 13 жніўня г. г., і выказваюць спачуванне сям'і памёршага.

Ад друкарні імя Сталіна

Дырэкцыя, партбюро, фабком і калектыў рабочых, ІТР і служачых друкарні імя Сталіна глыбока смуткуюць з прычыны смерці народнага паэта **Якуба Коласа** (Міцкевіча) і выказваюць спачуванне сям'і памёршага.

Ад Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага

Калектыў Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра БССР імя М. Горкага выказвае свой глыбокі смутак з выпадку смерці народнага паэта БССР **Якуба Коласа** і выказвае спачуванне яго сям'і.

Ад Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра імя ЛКСМБ

Калектыў Дзяржаўнага рускага драматычнага тэатра імя Ленінскага комсамола Беларусі глыбока смуткуе з прычыны цяжкай утраты — смерці народнага паэта Беларусі **Якуба Коласа** і выказвае спачуванне сям'і нябожчыка.

Прадстаўнікі карэйскага народа, што праходзяць вытворчую практыку на мінскіх прадпрыемствах, прышлі ўшанаваць памяць Якуба Коласа.

Народная гордасць

Мы асірацелі.

Глыбокі смутак агортвае сэрцы, на вачах дрыжаць слёзы: раптоўная смерць забрала ад нас вялікага Якуба Коласа.

Колас і Купала, як два волаты, стаяць разам ля вытокаў нашай новай літаратуры і як быццам дапаўняюць адзін другога. Мудрая проза Коласа, рэволюцыйны пафас яго лірыкі; страсная, імклівая, рэволюцыйная паэзія Купалы; магутная любоў абодвух да народа, да нашай прыроды, да роднага краю; спапяляючая нянавісць да ворагаў і велізарная маральная сіла іхняй творчасці,—узнімаюць нашу літаратуру і паэзію да ўзроўню агульначалавечай, а імёны абодвух паэтаў займаюць месцы ў Пантэоне Славы побач з Пушкіным, Міцкевічам і Шэўчэнкам.

Смерць Коласа ўскалыхнула нацыянальныя пачуцці народа. Дзесяткі тысяч прышлі, каб аддаць апошняе «Бывай!» любімаму паэту і грамадзяніну.

Колас — народная гордасць. Колас — нацыянальная сіла, якую нішто не зламала. Ён рад быў, што дажыў да таго часу, калі ўбачыў беларускі народ сапраўды шчаслівым у братняй сям'і совецкіх народаў.

Калі лепшыя сыны беларускага народа глядзелі праз краты Лукішскай турмы на казённы будынак акружнога суда ў Вільні, дзе шчодра мерылі прадстаўнікам беларускага народа гады катаржных работ, творчасць Коласа, як жывая крынічная вада, давала сілы змагарам, пранікала ў сырыя лёхі панскіх казематаў.

Забароненыя тады на нашых заходніх землях кнігі Коласа хадзілі ад сяла да сяла, з рук у рукі па этапных дарогах, будзячы надзеі нават у слабых духам, што ўз'яднанне народа ў адзінай Соцыялістычнай Дзяржаве не за гарамі. Колас прывітаў гэтую вялікую надзею ў жыцці нашага народа, стварыўшы эпапею «Рыбакова хата».

Родная зямля прыняла яго на вечны супачынак, але ён жыве і будзе вечна жыць у сэрцы народа, як вялікі настаўнік і баец за долю, за волю, за шчасце народа.

Вечная слава, вечная памяць паэту-змагару, паэту-грамадзяніну!

Рыгор ШЫРМА,
народны артыст Саюза ССР.

ЛЮБІМЫ ПІСЬМЕННІК

Вестка аб смерці вялікага сына беларускага народа Якуба Коласа балюча ўразіла мяне. У сэрцы абарвалася нешта вельмі дарагое і блізкае. Не хочацца верыць, што здарылася гэта, бо вобраз народнага паэта так глыбока ўвайшоў у маю свядомасць, і цяжка ўявіць, што больш не давядзецца пачуць яго такі пяшчотны бацькоўскі голас, не прыдзецца больш чытаць яго новых твораў.

Канстанцін Міхайлавіч запаланіў маё сэрца яшчэ тады, калі мне было дзесяць год. Гэта было напярэдадні першай рускай рэволюцыі. Мой старэйшы брат разам з Канстанцінам Міхайлавічам скончыў Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю. Яны былі блізкімі сябрамі, перапісваліся. З далёкай Пінішчыны малады вясковы настаўнік прысылаў чароўныя пісьмы-вершы.

З якой асалодаю я, дзесяцігадовы хлапчук, выкраўшы ў брата пісьмы і забраўшыся на дах старэнькай сялянскай хаты, паглынаў іх. Мне здавалася, што свет напаўняўся якімсьці незвычайным святлом, што я жыву ў нейкай казцы. І любіў-жа наш паэт свой працоўны народ! Ён гараваў яго горам, радаваўся яго радасцямі. У самы змрочны час царызма ён смела клікаў працоўных людзей на барацьбу з ворагамі за светлае жыццё.

Калі я сам пачаў працаваць настаўнікам і прачытаў «Новую зямлю» і «Сымона-музыку», яшчэ больш блізкім стаў мне Канстанцін Міхайлавіч. Страсна жадалася быць такім, як паэт, як яго цудоўныя героі. А як любяць яго нашы вучні! Урокі, прысвечаныя творчасці Якуба Коласа, — самыя цікавыя і жаданыя. Вучні захапляюцца гераізмам старога Талаша, рэволюцыйным запалам Данілы Смыка, вобразамі Сымона-музыкі, Міхала. Вось чаму з такім непасрэдным дзіцячым горам яны сустрэлі вестку аб смерці свайго любімага паэта.

Заслужаны настаўнік БССР
Васіль БАЦЭВІЧ.

Дукора, Рудзенск

Пахаванне Якуба Коласа

Раніцой 15 жніўня аднавіўся доступ працоўных да труны Якуба Коласа (Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча). На Цэнтральнай плошчы ля Палаца культуры профсаюзаў сабраліся працоўныя. Рабочыя, калгаснікі, настаўнікі, урачы, студэнты, інжынеры, воіны Совецкай Арміі прышлі сюды, каб развітацца з любімым паэтам. Міма труны прайшлі дзесяткі тысяч працоўных. Бясконцы людскі паток з'явіўся яркім сведчаннем народнай любві да Якуба Коласа — таленавітага паэта і грамадскага дзеяча. У памяшканні, дзе ўстаноўлена труна з целам памёршага, льюцца гукі жалобных мелодый.

Праз кожныя 5 мінут змяняецца ганаровая варта. Жалобную вахту нясуць пісьменнікі Міхась Лынькоў, Кандрат Крапіва, Пятро Глебка, Максім Танк, Аркадзь Куляшоў, Тарас Хадкевіч, Пімен Панчанка, воіны Совецкай Арміі, піонеры, работнікі прамысловых прадпрыемстваў і будоўляў, дзеячы навукі і культуры, партыйныя, совецкія і профсаюзныя работнікі.

З Канстанцінам Міхайлавічам развітваюцца вучоныя Акадэміі навук БССР, выкладчыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна і многіх іншых навучальных і навуковых устаноў сталіцы Совецкай Беларусі.

У залу ўносяць усё новыя і новыя вянкі — ад работнікаў комунальнай гаспадаркі, сувязі, аховы здароўя, асветы, культуры, навукі, калектываў прамысловых прадпрыемстваў.

Развітацца з Канстанцінам Міхайлавічам прыбылі прадстаўнікі Саюза пісьменнікаў СССР—Алексей Суркоў, Міхаіл Ісакоўскі, Нікалай Рыленкаў, пісьменнікі брацкай Украіны — Іван Нехода і Олекса Юшчэнка.

У 16 гадзін доступ у Палац культуры профсаюзаў спыняецца. Ля труны Якуба Коласа застаюцца сваякі і блізкія. На жалобную вахту становяцца першы сакратар ЦК КПБ К. Т. Мазураў, сакратары ЦК КПБ Ц. Я. Кісялёў, Ц. С. Гарбуноў, Ф. А. Сурганаў, камандуючы Беларускай Ваеннай акругай С. К. Цімашэнка, Міністр унутраных спраў БССР М. І. Баскакаў, першы намеснік Старшыні Совета Міністраў БССР І. Ф. Клімаў, загадчык аддзела партыйных органаў ЦК КПБ І. Н. Макараў, сакратар ЦК ЛКСМБ А. Н. Аксёнаў.

Труна з целам памёршага выносіцца і ўстанаўліваецца на Цэнтральнай плошчы. Тут-жа пачынаецца жалобны мітынг працоўных горада Мінска. Яго адкрывае сакратар ЦК КПБ тав. Гарбуноў. Затым з прамовамі выступаюць: пісьменнік Міхась Лынькоў, прэзідэнт Акадэміі навук БССР В. Ф. Купрэвіч, першы сакратар Саюза пісьменнікаў СССР Алексей Суркоў, украінскі пісьменнік Іван Нехода, сакратар ЦК ЛКСМБ А. Н. Аксёнаў, сакратар Мінскага абкома КПБ В. Ф. Шаура, электразваршчык трактарнага завода М. Т. Антонік, намеснік старшыні праўлення калгаса «Радзіма Якуба Коласа» Стаўбцоўскага раёна М. П. Дзімідовіч, першы намеснік Старшыні Совета Міністраў БССР І. Ф. Клімаў.

На могілках з развітальным словам выступілі паэт Пятро Глебка і брат памёршага І. М. Міцкевіч.

Прамова Ц. С. Гарбунова

Таварышы, цяжкую ўтрату панёс беларускі народ. Памёр выдатны пісьменнік, вялікі пясняр совецкага народа таварыш Якуб Колас (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч).

Усё сваё жыццё, усе свае сілы, свой вялікі талент мастака слова Якуб Колас аддаў справе працоўнага народа. Канстанцін Міхайлавіч разам са сваім другам незабыўным Янкам Купалам стварылі і развілі сучасную беларускую літаратуру, дапамаглі партыі выпеставаць цэлую плеяду беларускіх паэтаў, пісьменнікаў.

Якуб Колас, як [illegible] ную ніву ў бурныя гады першай рускай рэволюцыі 1905 года, ужо тады заваёўвае прызнанне і любоў шырокіх працоўных мас. Яго творчасці высокую ацэнку даў вялікі рускі пісьменнік Максім Горкі.

За 50 год сваёй літаратурнай дзейнасці Якуб Колас напісаў многа выдатных твораў, якія залатым фондам увайшлі ў скарбніцу нашай совецкай літаратуры.

Якуб Колас — адзін з вялікіх паэтаў нашага часу. Яго творы не насілі вузка нацыянальны характар. Яны заўсёды былі інтэрнацыянальныя. Ён выступаў як прапагандыст перадавых ідэй марксізма-ленінізма.

Якуб Колас — любімейшы паэт совецкіх народаў.

Якуб Колас унёс беларускі нацыянальны ўклад у скарбніцу агульначалавечай культуры. Яго творы перакладзены на многія мовы народаў Совецкага Саюза. Усе яго асноўныя творы перакладзены на мову вялікага рускага народа, які ідзе на чале народаў Совецкага Саюза і краін народнай дэмакратыі.

Якуба Коласа ведаюць і за рубяжом. Яго творы чытаюцца ў многіх краінах свету. Народнасцю сваіх твораў Якуб Колас заваяваў сэрцы мільёнаў людзей. Яго песні шчырыя і паэтычныя. Гэта песні любві і радасці. Творы Коласа — гэта заклікі да працы, да барацьбы за пабудову новага, комуністычнага грамадства.

Сваю плённую літаратурную дзейнасць Якуб Колас заўсёды спалучаў з актыўнай грамадскай і навуковай работай. Ён быў любімы партыяй і народам. Як любімец народа і партыі, ён карыстаўся высокім давер'ем. Ён з'яўляўся членам Цэнтральнага Камітэта Компартыі Беларусі, дэпутатам Вярхоўнага Совета СССР і Вярхоўнага Совета БССР, членам Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР, старшынёй Рэспубліканскага камітэта абароны міру. Сваёй творчасцю ён адстойваў справу міру.

Якуб Колас прымаў удзел у рабоце XX гістарычнага з'езду КПСС у якасці яго дэлегата ад Компартыі Беларусі.

У дні работы з'езду Якуб Колас, звяртаючыся да сабратаў па пяру, пісаў: «...Няхай нашым дэвізам будзе — разам з народам за шчасце народа!»

Да апошніх дзён ён вёў нястомную работу па ажыццяўленню выдатных рашэнняў і ідэй XX з'езду КПСС. Жыццё Якуба Коласа — гэта бліскучы прыклад служэння свайму народу, служэння справе комунізма.

Цэнтральны Камітэт КП Беларусі, Совет Міністраў БССР, Прэзідыум Вярхоўнага Совета Беларускай ССР глыбока смуткуюць з прычыны смерці Якуба Коласа.

Мы схіляем галовы перад прахам вялікага беларускага песняра. Памяць аб незабыўным Якубе Коласе будзе жыць у многіх пакаленнях совецкіх людзей.

Вечная табе слава, наш дарагі друг і таварыш!

Жалобны мітынг працоўных горада Мінска аб'яўляю адкрытым.

Прамова Міхася Лынькова

Дарагія таварышы, сябры!

Сёння мы праводзім у апошнюю дарогу выдатнага сына беларускага народа, яго вялікага паэта-грамадзяніна і вучонага, любімага і пачэснага старайшыну беларускіх пісьменнікаў, буйнейшага дзяржаўнага дзеяча краіны, нястомнага змагара за мір і дружбу народаў, народнага паэта рэспублікі Якуба Коласа.

Цяжка знайсці словы, каб выказаць усю глыбіню смутку і жалю, якія агарнулі нашы сэрцы пасля беззваротнай утраты Якуба Коласа. Імя Якуба Коласа ўзнаўляе ў нашай памяці цэлую эпоху ў жыцці беларускага народа — ад чорных дзён царызма да нашых дзён, калі беларускі народ выйшаў на шырокія прасторы жыцця і разам з братнімі народамі соцыялістычнай Радзімы стаў актыўным творцай новай гісторыі, і сваёй гераічнай працай, перамогамі і поспехамі набліжае светлае комуністычнае заўтра.

Усё жыццё, творчая і грамадская дзейнасць паэта былі арганічна і непарыўна звязаны з жыццём народа, з кроўнымі інтарэсамі чалавека працы. Па-сапраўднаму народным і магутным было яго паэтычнае дараванне. Таму і кожнае мастацкае слова паэта было па-народнаму проста, па-народнаму даступна, па-народнаму мудра.

Якуб Колас прайшоў доўгі і слаўны жыццёвы шлях. Былы селянін-бядняк, потым скромны настаўнік, якога праследавалі царскія сатрапы, ён прыйшоў у наш час да вяршынь соцыялістычнай культуры, стаў буйнешым любімым паэтам, прыўмножыўшым славу гераічнага беларускага народа, выхавацелем маладых пісьменнікаў і вучоных. Багаты жыццёвы і творчы шлях паэта з'яўляецца сімвалічным увасабленнем і таго слаўнага шляху беларускага народа, які прайшоў ён за апошняе поўстагоддзе,—ад змрочных часоў жабрацтва і бяспраўя да стварэння сваёй совецкай дзяржаўнасці, цудоўнага росквіту сваёй эканомікі і культуры.

Развітваючыся сёння назаўсёды са сваім настаўнікам, любімым другам і старшым таварышам, мы, беларускія пісьменнікі, абяцаем, што будзем заўсёды вучыцца ў Якуба Коласа яго адданаму служэнню народу, партыі і бязмежнай любві да Радзімы.

Няхай-жа жыве ў вяках слава народа, гордасць народа — бессмяротнае слова яго любімага паэта!

А яму, назаўсёды пакінуўшаму нас, скажам мы:

— Прымі, наш любы настаўнік і друг, наша апошняе «Бывай!»

Прамова В. Ф. Купрэвіча

Дарагія таварышы! З пачуццём глыбокага смутку схіляюць сёння галовы мільёны совецкіх людзей перад прахам выдатнага мастака слова, народнага паэта Беларусі, вучонага, грамадскага і дзяржаўнага дзеяча Якуба Коласа. Жыццёвы і творчы шлях Канстанціна Міхайлавіча — гэта шлях вернага сына беларускага народа, які з самага пачатку свайго жыцця звязаў свой лёс з лёсам працоўных мас. Яшчэ ў змрочныя часы царызма Якуб Колас, як гарачы патрыёт Радзімы, адным з першых беларускіх пісьменнікаў выступіў у абарону соцыяльных і нацыянальных правоў беларускага народа, у абарону правоў працоўнага чалавека. Думы і пачуцці народнага песняра — гэта думы і пачуцці простых людзей, з якімі звязаў ён усё сваё жыццё.

У асобе Якуба Коласа совецкая літаратура, навука і культура страцілі выдатнага пісьменніка і вучонага, чыё імя дорага не толькі кожнаму грамадзяніну нашай неабсяжнай Радзімы, але і мільёнам працоўных замежных краін.

Няма ў нашай рэспубліцы ніводнага кутка, дзе-б не чыталі, не вывучалі яго цудоўных, глыбока народных твораў. Як совецкі вучоны, лінгвіст і літаратуразнаўца, доктар філалагічных навук, акадэмік Акадэміі навук БССР і яе нязменны віцэ-прэзідэнт Якуб Колас праводзіў велізарную работу ў галіне беларускага мовазнаўства і літаратуразнаўства, у галіне развіцця беларускай навукі і культуры. Нам, вучоным Акадэміі навук, адным з заснавальнікаў якой з'яўляўся Якуб Колас, асабліва адчувальна ўтрата дарагога друга і таварыша па сумеснай рабоце.

Клапатліва і беражліва выхоўваў Канстанцін Міхайлавіч маладых вучоных Беларусі, вучыў іх упорнаму і нястомнаму авалоданню вяршынямі навукі.

Перастала біцца сэрца выдатнейшага дзеяча нашага народа, любімага яго песняра, нястомнага змагара за справу комунізма. Але ніколі не перастануць жыць і хваляваць мільёны людзей яго цудоўныя творы, яго выдатныя справы.

Светлая памяць аб табе, дарагі Канстанцін Міхайлавіч, будзе вечна жыць у нашых сэрцах, у сэрцах удзячных нашчадкаў.

Прамова Алексея Суркова

Глыбокім жалем аддалася ў сэрцы мільёнаў працоўных людзей нашай радзімы, ва ўсіх яе кутках вестка аб тым, што смерць вырвала з нашых радоў народнага паэта Беларусі, цудоўнага сына нашай вялікай соцыялістычнай Радзімы Якуба Коласа. У гэты жніўеньскі дзень, калі мы праводзім у апошні шлях нашага дарагога старэйшага друга, нашага дарагога старэйшага настаўніка, перад намі паўстае слаўны гераічны шлях, які прайшоў ён як выдатны паэт сваёй Радзімы, як беззаветны барацьбіт за будучыню беларускага народа, за вялікую і слаўную будучыню нашай вялікай совецкай Радзімы.

Кожнаму з нас, хто ведаў Канстанціна Міхайлавіча, чытаў яго творы, назаўсёды запала ў душу яго моцная, чыстая і шчырая паэзія, назаўсёды запаў у душу яго вобраз—скромнага, бясконца адданага свайму народу беларускага інтэлігента, які, узняўшыся з самай глыбіні народных мас, да апошняй мінуты жыцця беззаветна служыў сваёй Радзіме.

Праўленне Саюза пісьменнікаў СССР даручыла мне і таварышам, з якімі я прыехаў, Міхаілу Ісакоўскаму і Нікалаю Рыленкаву сказаць тут аб тым, што сярод паэтаў і празаікаў нашай краіны, што пішуць на ўсіх мовах яе народаў, вобраз Якуба Коласа будзе прыкладам высокага выканання грамадзянскага абавязку паэта.

Дарагі бацька Якуб! У гэтыя мінуты, на гэтай шырокай плошчы твайго роднага горада, перад тым, як пойдзеш ты ў апошні свой шлях і родная зямля прыме цябе ў свае мацярынскія нетры, дазволь нам, людзям, якія раслі ў малодшых пакаленнях совецкіх пісьменнікаў, сказаць табе, што тваё слаўнае імя назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах. Як эстафету мужнасці, сумленнасці, беззаветнага служэння народнай справе, совецкія людзі пранясуць твае вершы ад пакалення да пакалення, у светлую комуністычную будучыню нашай Радзімы.

Прамова Івана Неходы

Пісьменнікі совецкай Украіны даручылі мне і таварышу Олексу Юшчэнку сказаць, што ўсе людзі Украіны глыбока смуткуюць з прычыны смерці нашага дарагога друга, народнага паэта Беларусі Якуба Коласа.

Дазвольце мне прачытаць верш, які я напісаў на смерць Якуба Коласа.

ЯКУБА КОЛАСА ЛЮБИЛА УКРАЇНА

Якуба Коласа нема між нас,
Схилились в траурі братів моїх знамена.
Поезії найбільший світоч згас!
І слів журби невистачає в мене...

О, Білорусь, твій розділяю сум,
Якуба Коласа любила Україна...
Російськоі берізки чую шум,
Схилилась в тузі над Дніпром калина.

Недавно чули ми його в Москві,
Читав він вірші нам...
І ми аплодували...
Ми — учні, читачі його живі
Від круч Десни, від берегів Каяли...

О, Білорусь, нема кінця журбі!
Стою в жалобі,
Біль мені терзає груди...
Того, хто весь горів у боротьбі —
Повіки Батьківщина не забуде!

Кіраўнікі Компартыі Беларусі і Урада БССР выносяць труну з целам нябожчыка з Палаца культуры профсаюзаў.

Прамова А. Н. Аксёнава

Таварышы! З вялікім болем у сэрцы, разам з усім народам смуткуе з прычыны цяжкай утраты і моладзь совецкай Беларусі.

Маладое племя нашай рэспублікі, так любоўна і ласкава ўспетае ў таленавітых творах Якуба Коласа, аддае даніну глыбокай павагі і схіляе свае галовы перад труной вялікага сына беларускага народа, нашага выдатнага совецкага пісьменніка.

Якуб Колас быў горача любімым нашай моладдзю. Яго натхнёныя і палкія творы вядомы ўсёй совецкай моладзі.

Будучы палымяным патрыётам нашай Радзімы, велізарным чалавекалюбцам, Якуб Колас ведаў і любіў моладзь. Не адзін раз ён звяртаў свае позіркі да маладога пакалення, вучыў яго моцна любіць сваю Радзіму, смела і ўпэўнена крочыць у жыццё. Колас верыў у моладзь і прысвячаў ёй свае лепшыя паэтычныя радкі.

Яшчэ ў 1935 годзе, звяртаючыся да комсамольцаў, Якуб Колас пісаў:

Прывет вам, племя маладое,
Зямель совецкіх яснацвет!
Дарога ваша—шлях герояў,
У новы дзень бліскучы след.

Усе яго вершы, прысвечаныя моладзі, звернуты ў будучыню, клічуць да барацьбы, да дзеяння, вучаць беззаветнаму служэнню Радзіме і народу.

Не раз у гады выпрабаванняў і бур, якія перажывала краіна, як звон гучалі словы Коласа, звернутыя да моладзі. У гады Айчыннай вайны яго вершы клікалі на бой, да перамогі над фашысцкімі захопнікамі.

Уважліва наглядаючы за жыццём моладзі, за яе ўдзелам у працоўных подзвігах народа, Якуб Колас звяртаў да яе сваё палымянае слова паэта і заклікаў яе да новых перамог у комуністычным будаўніцтве.

І зараз, калі па закліку роднай Комуністычнай партыі комсамол і совецкая моладзь узняліся на штурм цалінных зямель, рушылі свае атрады на новабудоўлі Далёкага Усходу, Сібіры, Данбаса і Поўначы, з асаблівай сілай гучаць яго пранікнёныя словы:

Комсамоле, Яснацвеце,
Наша радасць, слава...
Арляняты, вярнігоры,
Ленінскія дзеці.

Узлятайце-ж вышэй, далей—
Вур і працы многа.
Абуджайце песняй далі,
Нястрыманай гулкай хваляй
К новым перамогам!

Совецкая моладзь заўсёды будзе памятаць і берагчы ў сваім сэрцы вобраз Якуба Коласа—палымянага патрыёта і вялікага мастака слова, актыўнага барацьбіта за жыццё, за мір, за шчасце совецкіх людзей. Наша моладзь будзе заўсёды памятаць яго палымяныя заклікі да барацьбы, да дзеяння, да новых перамог у будаўніцтве комунізма.

Бывай, Канстанцін Міхайлавіч, незабыўны пясняр, друг і настаўнік нашай моладзі!

Прамова В. Ф. Шаўры

Таварышы! Мы прыйшлі сюды, каб развітацца і праводзіць у апошні шлях народнага паэта Беларусі, нашага дарагога таварыша Канстанціна Міхайлавіча Міцкевіча—Якуба Коласа.

Цяжкая ўтрата, якую панёс беларускі народ. Раптоўная смерць спыніла выдатную літаратурную і грамадскую дзейнасць вернага сына Комуністычнай партыі, любімага пісьменніка працоўных Беларусі, буйнейшага мастака слова—Якуба Коласа.

Увесь час, да апошняй мінуты свайго жыцця Якуб Колас жыў інтарэсамі партыі, інтарэсамі народа, якім ён аддаў увесь свой магутны талент пісьменніка, усе свае сілы, усё сваё высакароднае жыццё.

Выдатныя творы Якуба Коласа, прасякнутыя любоўю да свайго народа, увайшлі ў скарбніцу многанацыянальнай совецкай літаратуры, сталі любімымі кнігамі мільёнаў совецкіх людзей.

Выдатны пісьменнік-комуніст Якуб Колас сваю шматгранную літаратурную дзейнасць заўсёды спалучаў з актыўнай грамадскай і навуковай дзейнасцю. Ён нясцынна быў звязаны з народам, удзельнічаў у вырашэнні важнейшых задач гаспадарчага і культурнага будаўніцтва нашай дзяржавы.

Працоўныя горада Мінска і Мінскай вобласці глыбока смуткуюць з выпадку смерці выдатнага сына беларускага народа, палымянага патрыёта совецкай Радзімы таварыша Якуба Коласа.

Светлая памяць аб Якубу Коласу назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах.

Прамова М. Т. Антоніка

Таварышы! Перастала біцца высакароднае сэрца нашага вялікага і горача любімага паэта Якуба Коласа.

Шматтысячны калектыў Мінскага трактарнага завода разам з усім беларускім народам шчыра смуткуе і схіляе галовы перад прахам вернага сына беларускага народа. Канстанцін Міхайлавіч аддаў свой светлы розум, усе свае сілы і энергію на карысць сваёй Радзімы. Ён горача любіў і верна служыў народу. У змрочныя гады царызма ў сваіх творах ён заклікаў народ на барацьбу супраць самадзяржаўя, за свабоду і шчасце працоўных. З яшчэ большай сілай развіўся талент і кіпучая дзейнасць паэта-патрыёта ў гады Совецкай улады і паэт поўнасцю і без астатку аддаваў іх справе будаўніцтва соцыялізма ў нашай краіне.

У гады Айчыннай вайны Якуб Колас ад усяго сэрца, горача клікаў сваіх братоў-беларусаў на свяшчэнную барацьбу супраць фашысцкіх акупантаў.

У сваіх творах, любімых народам, ён славіць людзей працы, кліча іх на новыя подзвігі ў імя перамогі комунізма.

(Заканчэнне на 4 стар.)

Жалобная працэсія. Фото І. Салавейчыка.

Пахаванне Якуба Коласа

Прамова М. Т. Антоніка

(Заканчэнне)

За ўсю шматгранную дзейнасць на карысць простага чалавека Якуба Коласа горача любяць працоўныя ў нас у Беларусі і далёка за яе межамі.

Бывай, наш дарагі Канстанцін Міхайлавіч. Мы ніколі, ніколі цябе не забудзем! Твой цудоўны вобраз назаўсёды застанецца ў нашых сэрцах.

Прамова М. П. Дзімідовіча

Таварышы! Паведамленне аб смерці народнага паэта Беларусі Якуба Коласа, нашага земляка, выклікала ў калгаснікаў сельгасарцелі «Радзіма Якуба Коласа» пачуццё глыбокага смутку.

За гады Совецкай улады непазнавальна змянілася аблічча радзімы Якуба Коласа. Тут створаны і набірае сілы калгас «Радзіма Якуба Коласа». У вёсцы Мікалаеўшчына ёсць выдатная сярэдняя школа, якая носіць імя Якуба Коласа, пабудаваны вялікі сельмаг, бальніца, дзве бібліятэкі, калгасны клуб.

Якуб Колас радаваўся нашым поспехам. Ён часта прыязджаў да сваіх землякоў, сустракаўся з калгаснікамі, сельскай інтэлігенцыяй. Ён заклікаў нас падвоіць, патроіць свае намаганні ў барацьбе за далейшы ўздым калгаснай вытворчасці.

Калгаснікі любяць Якуба Коласа. Яны чытаюць і перачытваюць яго выдатныя творы, якія заклікаюць да барацьбы за комунізм, за народнае шчасце, за мір ва ўсім свеце.

Праводзячы Якуба Коласа ў апошні шлях, мы глыбока смуткуем аб ім—выдатным чалавеку нашай эпохі. У сваіх сэрцах мы назаўсёды захаваем аб ім светлую памяць.

Бывай, наш дарагі зямляк!

Прамова І. Ф. Клімава

Дарагія таварышы! Сёння мы праводзім у апошні шлях свайго горача любімага Якуба Коласа—аднаго з найбольш таленавітых сыноў беларускага народа, буйнейшага пісьменніка і выдатнага грамадскага дзеяча, з імем якога звязана цэлая эпоха ў гісторыі барацьбы і духоўнага развіцця беларускага народа.

Вялікі і выдатны шлях прайшоў народны паэт Беларусі Якуб Колас. Сын селяніна-бедняка, які з ранняга дзяцінства спазнаў цяжкую нястачу і бяспраўе працоўнага народа, Канстанцін Міхайлавіч пачаў сваю грамадскую і палітычную дзейнасць у бурны час першай рускай рэволюцыі.

Ужо ў 1905 годзе, калі большэвікі заклікалі рабочых і сялян да ўзброенага паўстання супраць царызма, Якуб Колас прыходзіць да вываду, што гэта адзіны шлях для паляпшэння жыцця працоўных. У змрочныя гады сталыпінскай рэакцыі Якуб Колас у турэмным зняволенні піша свой выдатны верш «Мужык», заключныя словы якога гучаць заклікам да ўзброенай барацьбы супраць царызма.

Якуб Колас быў вялікім аптымістам, ён бязмежна верыў у сілы народа.

У цяжкія дні Вялікай Айчыннай вайны, калі ўвесь совецкі народ пад кіраўніцтвам роднай Комуністычнай партыі вёў крывавую барацьбу з узброенымі да зубоў фашысцкімі полчышчамі, палымяным заклікам да барацьбы з ворагам гучалі словы народнага паэта:

Паўстань, народ, злучы ўсе сілы
Супроць тэўтонскае арды,
Супроць пачвары тупарылай,
Што нішчыць сёлы, гарады!

Іменна ў гэты час, у 1942 годзе, Якуб Колас уступіў у рады Комуністычнай партыі. Народны паэт рэспублікі, акружаны прызнаннем і любоўю народа, прыйшоў да вываду, што яго месца ў радах вялікай Комуністычнай партыі—арганізатара і натхняльніка гістарычных перамог совецкага народа.

Якуб Колас прымаў самы актыўны ўдзел у культурным і гаспадарчым будаўніцтве нашай краіны. Усе свае сілы, веды, талент ён аддаваў справе служэння народу, справе пабудовы комуністычнага грамадства.

Светлае імя выдатнага сына беларускага народа Якуба Коласа, палымянага патрыёта совецкай Радзімы, вялікага мастака, заўсёды будзе жыць у нашых сэрцах.

Вечная памяць табе, наш незабыўны друг і таварыш!

Прамова П. Ф. Глебкі

Таварышы! Мы праводзім у апошнюю і незваротную дарогу вялікага паэта нашай Радзімы. Над яго адкрытай магілай разам з працоўнымі сталіцы агорнутыя глыбокім смуткам сэрцы ўсяго беларускага народа. Ад нас назаўсёды адышоў чалавек, які ўсё сваё кіпучае жыццё, поўнае трывог за лёс народа, аддаў высакароднай барацьбе за светлае шчасце чалавека працы.

Будучы сынам беззямельнага селяніна, Канстанцін Міхайлавіч (Якуб Колас) зведаў гаротную ў мінулым долю працоўнага чалавека на сваім уласным вопыце. Жахлівую беднасць, цёмнае бяспраўе народа ён бачыў штодзённа і ў сваім маленстве, і ў свае маладыя гады, калі працаваў ужо настаўнікам у глухім Палессі. І сумленнае мужнае сэрца вернага сына народа не магло маўчаць і мірыцца з цёмным светам адвечнай няволі і несправядлівасці. Яно адгукнулася на крыўды народа палымянымі вершамі, напісанымі на забароненай тады беларускай мове. Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч становіцца выдатным песняром, глашатаем дум свайго народа — Якубам Коласам.

Царскі ўрад усімі сіламі імкнуўся заглушыць непадкупны голас паэта. Але ні жорсткія рэпрэсіі, ні турэмнае зняволенне не зламаді рэволюцыйнага духу і волі Якуба Коласа. Ён заўсёды быў разам з працоўнымі, жыў іхняй барацьбой і надзеямі, нястомна клікаў да перамогі над светам зла і няпраўды. І калі над краінай засвяціла сонца свабоды, Якуб Колас стаў у першыя рады будаўнікоў новага свету — свету людскога шчасця і справядлівасці.

Нашы сучаснікі і будучыя пакаленні з глыбокай удзячнасцю будуць чытаць і перачытваць неўміручыя творы народнага паэта. У іх шчырых, непадкупных радках б'ецца і будзе няспынна біцца жывое, гарачае, чыстае сэрца светлага чалавека, адданага грамадзяніна, вернага комуніста. На старонках яго твораў нашы сучаснікі і наступнікі прачытаюць суровую і светлую гісторыю свайго народа за апошнія 50—60 гадоў. У паэме «Новая зямля» і паэскай трылогіі яны ўбачаць ва ўсіх яе рознастайных колерах мінулую Беларусь з яе простай і непаўторнай красой прыроды, з яе працавітымі і шчырымі людзьмі, поўнымі імкненняў і пошукаў свабоды і праўды. Паэма «Сымон-музыка» раскажа ім аб таленавітасці народа, «Казкі жыцця» — аб яго мудрасці. Са старонак такіх твораў, як недакончаная эпапея «На шляхах волі», аповесць «Дрыгва», паэмы «Рыбакова хата», «Адплата», «Суд у лесе», перад чытачом паўстануць велічныя карціны гераічнай барацьбы народа за сваё вызваленне, глянуць мужныя твары змагароў за свабоду і шчасце Радзімы. Аповесць «На прасторах жыцця», «Адшчапенец» і многія іншыя творы будуць апавядаць аб працоўных подзвігах народа ў справе будаўніцтва сацыялістычнага грамадства.

Усё жыццё, уся грамадская дзейнасць, уся вялікая і чыстая творчасць Якуба Коласа застануцца для нас прыкладам самаадданага служэння свайму народу, сваёй Радзіме.

Бывай-жа, наш незабыўны настаўнік і друг!

Няхай будзе лёгкай табе родная зямля, па якой ты з чыстым сэрцам прайшоў праз усё сваё жыццё і якую ты апеў і ўславіў сваім ясным, шчырым, добрым словам!

Бывай!

СВЕТЛАЙ ПАМЯЦІ ПАЭТА, НАСТАЎНІКА, ГРАМАДЗЯНІНА

Незабыўны Колас

Пісьменнікі Масквы выказваюць сваё глыбокае спачуванне пісьменнікам Беларусі і сям'і незабыўнага Якуба Коласа з прычыны цяжкай утраты.

Прэзідыум Маскоўскага аддзялення СП СССР: Федзін, Далматоўскі, Пісаржэўскі, Чэртова, Чэпурын, Ісакоўскі, Іванаў, Атараў, Антакольскі, Прылежаева.

На ўсім прасторы украінскай зямлі

Пісьменнікі Совецкай Украіны са смуткам і пашанай нізка схіляюць галовы перад труною вялікага пісьменніка братняга беларускага народа. Побач з імёнамі найслаўнейшых пісьменнікаў чалавецтва будзе стаяць у вяках светлае імя Якуба Коласа. Яго творчасць вядома і любіма на ўсім прасторы украінскай зямлі, яго творчасць паэта-патрыёта, комуніста — неўміручая.

Саюз пісьменнікаў Украіны.

Яго слова будзе жыць у сэрцы народа

Глыбока смуткуем аб цяжкай утраце вернага сына Радзімы, вялікага паэта, друга—Якуба Коласа, чыё гарачае слова заўсёды будзе жыць у сэрцы народа.

Ад імя ленінградскіх пісьменнікаў: Пракоф'еў, Холапаў, Саянаў, Панова, Арлоў, Гранін, Чывілікін.

Падзяляем ваша гора

Пісьменнікі Латвіі разам з беларускімі таварышамі па пяру і ўсім совецкім народам глыбока смуткуюць з прычыны смерці народнага паэта Беларусі Якуба Коласа. Памяць аб выдатным песняру душы народа застанецца вечна жыць у нашых сэрцах.

Праўленне Саюза пісьменнікаў Латвіі.

Сардэчнае спачуванне

Пісьменнікі Смаленшчыны глыбока смуткуюць з выпадку смерці выдатнага мастака слова, аднаго з буйнейшых майстроў совецкай многанацыянальнай літаратуры, народнага паэта Беларусі Якуба Коласа і выказваюць сваё шчырае спачуванне ўсім сябрам і блізкім нябожчыка.

Рыленкаў.

Творчасць яго бессмяротна

Пісьменнікі совецкага Туркменістана выказваюць пачуццё глыбокага смутку з прычыны смерці выдатнага совецкага паэта Якуба Коласа. Яго цудоўная творчасць вядома туркменскаму чытачу. Памяць аб ім назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах.

Праўленне СП Туркменістана.

Смуткуем разам з вамі

Пісьменнікі Азербайджана разам з вамі смуткуюць з прычыны смерці выдатнага народнага паэта Беларусі Якуба Коласа. Творы паэта ўвайшлі ў залаты фонд беларускай літаратуры. Гэтыя творы дарагія і нам—азербайджанскім чытачам. Прыміце нашы шчырыя спачуванні.

Прэзідыум Саюза пісьменнікаў Азербайджана.

За хаваем памяць аб браце і другу

Утрата выдатнага майстра паэзіі Якуба Коласа—гора ўсёй совецкай літаратуры. Пісьменнікі Таджыкістана разам з усімі беражна захоўваюць памяць аб браце і другу, вялікім змагару за шчасце Айчыны. Магутная сіла вершаў народнага паэта Беларусі назаўсёды застанецца ў высакародным сэрцы народа.

Мірзо Турсун-задэ, Міршакар, Акрамі, Ніязі, Бокі Рахім-задэ, Рахімі, Ашырмат Назараў, Рахім Джаліл, Гафар Мерзоеў, Дэхоці, Улуг-задэ.

Светлы вобраз

З глыбокім смуткам малдаўскія пісьменнікі даведаліся аб цяжкай утраце беларускай і ўсёй многанацыянальнай совецкай літаратуры—смерці народнага паэта Беларусі Якуба Коласа. Вялікі песняр свайго народа, ён быў любімы ўсімі людзьмі нашай неабсяжнай Радзімы. Яго творы, што клічуць да барацьбы за свабоду і шчасце, былі ўзорам грамадзянскай мужнасці, служэння народу, вернасці ў барацьбе за справу комунізма. Светлы вобраз мужнага незабыўнага Якуба Коласа будзе вечна жыць у нашых сэрцах.

Лупан, Букаў, Істру, Барскі, Карняну, Кручанюк, Менюк, Панамар, Дарыенка, Куткавецкі, Чабану, Друца.

Глыбокі смутак

Чувашскія пісьменнікі глыбока смуткуюць з прычыны смерці незабыўнага Якуба Коласа, выказваюць спачуванне Саюзу пісьменнікаў Беларусі, сям'і, родным.

Талвір, Эльгер, Хузангай, Алга.

Шчырыя пачуцці

Сумная вестка аб смерці народнага паэта Беларусі Якуба Коласа хутка абляцела гарады і сёлы Совецкага Саюза і адгукнулася глыбокім болем у сэрцах працоўных. У адрас камісіі па арганізацыі пахавання паэта, а таксама ў адрас Саюза пісьменнікаў БССР паступілі шматлікія тэлеграмы. У іх рабочыя, служачыя, інтэлігенцыя, пісьменнікі братніх рэспублік і работнікі мастацтва выказваюць свае глыбокія пачуцці смутку з прычыны цяжкай утраты.

З Віцебска стужка тэлеграфа прынесла поўныя жалю радкі: «Работнікі бібліятэкі імя Якуба Коласа выказваюць глыбокі смутак з прычыны смерці Якуба Коласа—народнага пісьменніка Беларусі, творы якога вядомы і блізкія кожнаму чытачу».

Выхаванцы Брэсцкага дзіцячага дома, які носіць імя Якуба Коласа, пішуць у сваёй тэлеграме: «Па радыё даведаліся аб смерці дарагога і любімага Канстанціна Міхайлавіча. Яшчэ раз перачыталі ўсе яго лісты да нас, успомнілі яго гутаркі з намі і цяжка паверыць, што яго няма ў жывых...»

Тэлеграмы паступілі ад рэдакцыі украінскага часопіса «Вітчизна», калектыву работнікаў Мінскай студыі тэлебачання, рэдакцыі газеты «Кліч Радзімы» Любанскага раёна, Гродзенскага абласнога трэста Маслапрома, піонераў і работнікаў Мінскага палаца піонераў, Магілёўскага абласнога камітэта партыі і аблвыканкома, рэдакцыі і выдавецтва акруговай газеты Беларускай Ваеннай Акругі «Во славу Родины».

Свае спачуванні прыслалі пісьменнікі К. Сіманаў, Н. Тіханаў, В. Ажаеў, Е. Мазалькоў, Б. Ірынін, Л. Леонаў, В. Лідзін, К. Буйла, артысты Л. Александроўская, К. Саннікаў, Г. Глебаў, П. Малчанаў, С. Бірыла і іншыя.

На новай пасадзе

Яўфалія Васільеўна Смірнова зайшла ў хату-чытальню і разгубілася. Шпалеры на сценах абарваны, падлога брудная, у памяшканні холадна. На паліцы абы-як раскіданы кнігі, пасярод пакоя — невялічкі столік і дзве лаўкі.

Назаўтра Яўфалія Васільеўна зноў была на рабоце. Запаліла печку, вымыла падлогу. Затым узялася за ўпарадкаванне літаратуры. Роўнымі радамі расставіла кнігі, завяла новыя фармуляры на кожнага чытача, напісала і вывесіла на дзвярах новы распарадак дня. А калі гэта было зроблена, яна склала на тыдзень план работы, узгадніла яго са старшынёй сельсовета.

У клопатах непрыкметна прайшоў першы дзень работы на новым месцы. І толькі Яўфалія Васільеўна збіралася схадзіць на абед, як у памяшканне хаты-чытальні зайшло некалькі дзяўчат.

— Вось і добра, што вы прыйшлі, — узрадавана сказала першым наведвальнікам Смірнова. — Давайце, дзяўчаткі, вось тут прымацуем плакаты, а тут — партрэты, а гэтае месца пакінем для насценнай газеты.

Дзяўчаты вярталіся дадому з кнігамі ў руках. А назаўтра ў хату-чытальню прыйшло значна больш калгаснікаў сельгасарцелі імя Маленкова. Адны з іх неслі абмяняць кнігу, другія жадалі пачытаць газету, часопіс, паслухаць радыё, пагуляць у шашкі і шахматы. Поўнасцю задаволіць калгаснікаў усім неабходным не было магчымасці. Мала было газет, не хапала месца, дзе-б можна было сесці. Тады Смірнова дамовілася ў сельсавеце аб набыцці сталоў і лавак, атрымала сродкі на папаўненне новай літаратурай бібліятэкі, выпісала 12 газет.

Неўзабаве быў створаны совет хаты-чытальні. З дапамогай яго ў хаце-чытальні былі абсталяваны стэнд, прысвечаны рашэнням XX з'езду КПСС, фотамантаж «За здаровы быт», выстаўка навукова-папулярнай літаратуры. Знайшліся ў вёсцы аматары музыкі, танцоры, спевакі, дэкламатары, шашысты, шахматысты і валейбалісты. Пачалі працаваць гурткі мастацкай самадзейнасці. Сельскія артысты выступілі з канцэртамі перад калгаснікамі. Паступова ажыўлялася культурная работа ў вёсцы. Хата-чытальня ператварылася ў цэнтр культурна-масавай работы.

З дапамогай партыйнай арганізацыі пры хаце-чытальні была створана лектарская група. У яе склад увайшлі настаўнікі, медыцынскія работнікі, спецыялісты сельскай гаспадаркі. Яны часта выступаюць перад хлебаробамі з цікавымі лекцыямі і дакладамі, праводзяць гутаркі. Жаданымі гаснямі ў калгаснікаў бываюць агітатары Васіль Дземідовіч, Сямён Дамброўскі, Уладзімір Курылёў і іншыя.

Сваю дзейнасць Яўфалія Смірнова не абмяжоўвае сценамі хаты-чытальні.

У калгасе ішоў сенакос. Частым госцем на лугах была Яўфалія Васільеўна. Штодзённа дастаўляла яна сюды газеты, чытала іх. Разгарнулася масавая ўборка ўраджаю. І зноў Смірнова цэлыя дні ў полі. Не забывае яна і жывёлаводаў, хаця статак знаходзіцца ў лагеры, на значнай адлегласці ад цэнтральнай сядзібы калгаса. Загадчыца хаты-чытальні паспее пабываць і тут. Акуратна заменіць кнігу, даставіць свежыя газеты, часопісы, правядзе гутарку, дапаможа выпусціць «баявы лісток», раскажа аб важных навінах.

Звыш 350 калгаснікаў з'яўляюцца пастаяннымі чытачамі. У чатырох паляводчых брыгадах створаны бібліятачкі-перасоўкі. Ёсць яны і на жывёлагадоўчых фермах. Некалі забруджаны пакойчык, дзе ў беспарадку была звалена літаратура, стаў чыстым і ўтульным. На паліцах акуратна расстаўлены больш двух тысяч розных кніг.

Нядаўна комуністы пярвічнай партарганізацыі калгаса імя Маленкова выбралі т. Смірнову сакратаром арганізацыі. Здольная, ініцыятыўная, яна паспяхова спраўляецца са сваімі абавязкамі. змагаецца за стварэнне культурнага адначынку для працаўнікоў вёскі.

В. БЫЧОК.

З запісной кніжкі журналіста

У БРАТНЯЙ ЛІТВЕ

Не многім членам беларускай дэлегацыі, якая правярала ход спаборніцтва паміж работнікамі сельскай гаспадаркі Літвы і Беларусі, даводзілася раней бываць у нашых суседзяў. Натуральна, што нас цікавіла не толькі сельская гаспадарка, але ўсё, што мы бачылі ў брацкай рэспубліцы.

НА СВЯЦЕ ПЕСНІ

Адна група, якая правярала дагавор аб соцыялістычным спаборніцтве паміж калгасамі Беларусі і Літвы, накіравалася ў Клайпедскую зону раёнаў. На шляху ляжаў другі па велічыні горад рэспублікі—Каўнас. Невялікі, але чысты, акуратны, зялёны, ён з першага погляду спадабаўся нам. Гэта горад старажытных традыцый літоўскага народа.

Адной з такіх выдатных традыцый з'яўляецца Свята песні. Калі мы прыбылі ў Каўнас, нам паведамілі, што ў Даліне песні, на адной з ускраін горада, будзе выступаць народны хор з дзесяці тысяч спевакоў. У праграме свята многа танцавальных нумароў. Першы сакратар ЦК КП Літвы тав. Снечкус запрасіў нашу дэлегацыю прысутнічаць на свяце.

Даліна песні—велізарная натуральная глядзельная зала, размешчаная на схіле аднаго з яраў. На процілеглым схіле — сцэна, на якой могуць змясціцца дзесяткі тысяч выканаўцаў. Унізе—пляцоўка для танцавальных нумароў. Глядзельная зала і сцэна акаймаваны векавымі дрэвамі. З велізарнай цікавасцю слухалі мы старажытныя і сучасныя літоўскія народныя песні, глядзелі жыццерадасныя, імклівыя танцы.

У час выканання аднаго з нумароў раптам раздаліся бурныя апладысменты. Апладзіравалі гледачы і выканаўцы. Усе глядзелі ў бок дарогі. Адтуль, ледзь гойдаючыся, лёгка плыў флаг Беларускай ССР. Гэта прыбылі на Свята песні прадстаўнікі нашай рэспублікі — калектывы мастацкай самадзейнасці мінскай фабрыкі імя Кагановіча і Белпромсовета — спевакі і танцоры. Удзельнікі свята ад душы віталі прадстаўнікоў беларускага народа.

Сардэчна былі сустрэты прадстаўнікі вялікага рускага народа—калектывы мастацкай самадзейнасці Смаленшчыны і Калінінскай вобласці, таленавітыя выканаўцы народных песень і танцаў Латвіі і Эстоніі. Літоўскае Свята песні стала святам народаў нашай вялікай Радзімы.

Работнікі фабрыкі імя Кагановіча ўручылі прадстаўнікам горада Каўнаса падарунак—маленькія мадэлі прадукцыі, якую выпускае іх прадпрыемства.

БУДУЕЦЦА НОВАЯ ВЁСКА

Гады тры назад у калгас імя Юліі Жэмайтэ прыехала група людзей з горада. Яны хутка пазнаёміліся з калгаснікамі, хадзілі на фермы, у паляводчыя брыгады, усё распытвалі, да ўсяго прыглядаліся.

Гэта былі артысты яшчэ маладога Клайпедскага драматычнага тэатра, якія выехалі ў творчую камандзіроўку. Тэатру патрэбна было ставіць п'есу «Пары» пачынаючага драматурга К. Сая. У ёй адлюстроўваюцца жыццё калгаснай вёскі, барацьба перадавых людзей сельгасарцелі з адсталымі, гультаямі. Канфлікт паданы ў п'есе ўдала, але многія вобразы трэба было дапрацаваць. Тэатр вырашыў дапамагчы драматургу. Для гэтага і была задумана паездка ў калгас. Але куды ехаць?

— Едзьце ў сельгасарцель імя Юліі Жэмайтэ,—параілі артыстам партыйныя работнікі.—Там вы якраз знойдзеце жывыя вобразы для сваёй пастаноўкі.

Парада аказалася добрай. Артысты ўбачылі ў калгасе многа такога, што не вычытаеш у кнігах. Яны сустрэлі і людзей тыпу Дамінікаса—гультая, аднаго з герояў п'есы, і штосьці накшталт пляткаркі Веранікі, брыгадзіра Вайнаруса. Артыстам, якія маюць пільнае, назіральнае вока, не цяжка было заўважыць смешныя і непрыемныя рысы ў характары гэтых людзей і багацце душэўных якасцей перадавікоў калгаснай вёскі. Узяць хоць-бы брыгадзіра будаўнічай брыгады калгаса В. Барыса. Гэта — сапраўдны майстар сваёй справы. Ён не толькі будаўнік, але і паэт, і акцёр, і спявак. У яго руках любая справа спявае і грае. А як трапна, як бязлітасна высмейвае ён гультаёў і дармаедаў. Яны, як агню, баяцца яго пякучых частушак.

З удзячнасцю ад'язджалі артысты з сельгасарцелі. Работа над п'есай хутка пайшла на лад. Цяпер спектакль «Пары»—адзін з лепшых у рэпертуары тэатра. Калгаснікі сельгасарцелі, і асабліва брыгадзір будаўнічай брыгады тав. Барыс, могуць ганарыцца, што сваёй працай, сваім жыццём дапамаглі стварыць добры спектакль, які карыстаецца поспехам

Вось у гэты калгас і прыехала група работнікаў сельскай гаспадаркі Беларусі. Калгаснікі сустрэлі беларусаў з вялікай гасціннасцю і ахвотна паказвалі сваю гаспадарку. Больш за ўсё спадабалася нашай дэлегацыі арганізацыя будаўнічай справы ў гэтай сельгасарцелі.

У калгасе створаны дзве будаўнічыя брыгады. Адна ўзводзіць грамадскія пабудовы, другая—дамы для калгаснікаў, якія яшчэ жывуць на хутарах. Будаўніцтва вядзецца ў адным цэнтры.

Калгаснік-забудоўшчык не ўдзельнічае ў будаўнічых работах. Яму ўсё робіць калгасная брыгада—і завозіць неабходныя матэрыялы, і будуе дом. Калгаснік атрымлівае гатовае памяшканне. Ён выпісвае ў банку крэдыт на матэрыялы і перадае грошы калгасу. Працоўныя затраты на будаўніцтва дома таксама праведзены ў крэдыт: з калгасніка потым затрачаныя на будаўніцтва дома працадні будуць вылічвацца на працягу пяці або дзесяці год, як вырашыць праўленне.

Хлебаробы ахвотна на такіх умовах будуюць сабе дамы ў калгасным цэнтры. Надакучыла ім воўчае жыццё на хутарах. І калгасным мулярам (а дамы ў Літве будуюцца пераважна з цэглы) цяпер многа работы. Па ўсёй рэспубліцы няспынна растуць і добраўпарадкоўваюцца калгасныя цэнтры. Мяняецца аблічча новай Літвы.

ЯНТАРНЫ БЕРАГ

Шумяць хвалі Балтыйскага мора, тысячагоддзямі перамываюць яны прыбярэжны пясок. Гэтай сваёй неўтаймаванай работай яны часам аказваюць і некаторую паслугу чалавеку: размываючы пясок, выносяць на бераг кавалкі каштоўнага янтару.

Бераг Балтыкі можа пахваліцца янтарнай вытворчасцю. Значная частка янтару здабываецца ў пасёлку Янтарным Калінінградскай вобласці. Але вельмі многа яго вымываецца хвалямі ў раёне Клайпеды і Паланга. Кожную раніцу на бераг з сачкамі і кошыкамі выходзяць шукальнікі гэтага каштоўнага дара прыроды. Часцей хвалі выплёскваюць толькі невялікія зерні янтару, а іншы раз кавалкі важаць каля кілограма.

У пасёлку Паланга райпромкамбінат і промыславая арцель «Літвос гінтарас» заняты апрацоўкай янтару. Мы пазнаёміліся з работай промыславай арцелі. Яна зусім невялікая—дзесяткі два работнікаў. Але паспрабуйце знайсці горад краіны, у магазінах якога вы не ўбачылі-б прыгожых вырабаў майстроў арцелі «Літвос гінтарас». Хто-ж яны, гэтыя ўмельцы, якія вырабляюць такія прыгожыя брошкі, пацеркі, бранзалеты, пудраніцы?

Начальнік янтарнага цэха Вітаўшас Валяўга знаёміць нас з вытворчасцю. Ён бярэ кавалак янтару, хутка прыкідвае, што з яго можа атрымацца, і гаворыць шліфавальшчыку Іозасу Язбуцісу:

— Зрабі з гэтага брошку.

Уключаны шліфавальныя станкі. Спачатку праводзіцца павярхоўная, грубая апрацоўка кавалка. Затым шліфавальшчык пераходзіць на другі станок, больш дакладнай апрацоўкі, і спрытнымі, дакладнымі рухамі падстаўляе янтар да барабана, які хутка круціцца. Узнімаецца воблачка белага пылу—гэта з кавалка зляцеў непатрэбны пласт. Затым наступны станок. На нашых вачах эдзіўляючай празрыстасці брошка набыла пэўную форму, зайграла пералівамі своеасаблівага святла. Як відаць, таямніца ўсякага сапраўднага майстэрства і заключаецца ў тым, каб вось так лёгка, без намаганняў, надаваць рэчам самыя лепшыя якасці і прыгажосць.

У арцелі «Літвос гінтарас» нямала такіх майстроў. Марыя Аужэлене, Стася Венскене, Данута Норкене, Стасіс Норкус і многія іншыя ўмельцы выпускаюць да 50 відаў вырабаў з янтару і 15 з дрэва.

Многія рэчы, зробленыя з янтару, а таксама шпількі, якія прымацоўваюць упругожанні да адзення, пакрываюцца тонкім пластам золата. Гэтую работу выконвае маладая дзяўчына Рэгіна Локіцэ. Яна вельмі любіць сваю справу і не хоча яе пакідаць ні за што.

— Янтарная вытворчасць па-сапраўднаму толькі пачынае наладжвацца, — гаворыць яна. — У нас вялікая будучыня.

* * *

Многа цікавага і павучальнага бачыла наша дэлегацыя на літоўскай зямлі. Гэта была першая паездка работнікаў сельскай гаспадаркі Беларусі ў суседнюю брацкую рэспубліку, пачатак спаборніцтва, якое набывае ўсё большы і большы размах.

І. НОВІКАЎ,
В. ПЛЕШАВЕНЯ.

Скарбы польскага мастацтва

Пісьмо з Ленінграда

У ленінградскім Эрмітажы адкрыта вялікая выстаўка твораў з польскіх музеяў. Яна выклікае цікавасць ленінградцаў. Сярод скарбаў Эрмітажа, які з'яўляецца буйнейшым музеем свету, амаль не прадстаўлена польскае мастацтва. Гэты сур'ёзны прабел як-бы запаўняе адкрытая цяпер выстаўка.

Асабліва шырока прадстаўлена ў ёй польскае мастацтва другой палавіны XIX стагоддзя. Ленінградскі глядач знаёміцца з выдатнымі палотнамі Александра Герымскага, у якіх паказаны лёс абязздоленага польскага селяніна. Такія работы Герымскага, як «Вячэрняя малітва», «Поўднёвы адпачынак», «Сялянская труна» — выдатныя творы мастацтва. Для іх характэрны выразная сацыяльная тэма і выдатнае майстэрства. Своеасаблівы і арыгінальны мастак Станіслаў Ленц. Яго групавыя партрэты («Марскія ваўкі», «Дыскусія» і інш.) характэрныя выключнай экспрэсіяй і выразнасцю.

Яцэк Мальчэўскі — значны і своеасаблівы мастак. Ён стварае глыбока нацыянальныя па форме творы. З яго карцін вылучаецца партрэт вядомага польскага пісьменніка Уладзіслава Рэйманта, напісаны на фоне беднай польскай вёскі. У гэтым партрэце пісьменніка як-бы ўвасоблена асноўная тэма яго твораў.

Найбольш папулярны польскі мастак Ян Матэйка прадстаўлены серыяй манументальных гістарычных твораў. З іх вылучаецца трагічны партрэт вядомага ў польскай гісторыі Станчыка-блазана пры двары польскага караля Сігізмунда Старога. Гэта вельмі яркі вобраз чалавека з народа, які, апрануты ў касцюм блазана, цяжка перажывае свой трагічны лёс. Поўнае экспрэсіі і сілы другое палатно Матэйкі паказвае смерць польскага караля Сігізмунда Аўгуста і разгубленасць, якая панае сярод прыдворных. З іншых карцін гістарычнага і батальнага жанра трэба адзначыць творы Юзэфа Брандта, асабліва яго вялікія палотны «Змаганне пры Хоціне» і «Выезд польскага караля Яна Сабескага».

Анна Біліньская-Багдановіч — цікавы мастак-партрэтыст. Асабліва лірычныя яе жаночыя партрэты.

Серыя выразных партрэтаў Марчэло Бачэрэлі прысвечана жыццю польскага грамадства сярэдзіны XVIII стагоддзя.

Цікавыя партрэты Юзэфа Пешкі (XVIII стагоддзе). Вельмі паэтычны «Партрэт трох дам». Мастацтва XVII стагоддзя прадстаўлена серыяй арыгінальных прац Шымановіч-Семігіноўскага.

Своеасаблівыя пейзажы Яна Плерша (XVIII стагоддзе). З больш позніх майстроў малюнка трэба адзначыць работы Францішэка Кастшаўскага. Маслоўскага і інш. Выдатным рысавальшчыкам з'яўляецца вядомы польскі паэт і драматург Станіслаў Выспяньскі, малюнкі якога таксама прадстаўлены на выстаўцы.

Арыгінальная і польская гравюра. Вялікае майстэрства характэрна для творчасці гравёра XVIII стагоддзя Яна Фрэя, прадстаўленага серыяй афортаў з альбомаў помнікаў старой Польшчы. Арыгінальны прадстаўнік нацыянальнай графікі — выдатны майстар канца XIX стагоддзя Леон Вычулкоўскі. Выклікаюць цікавасць таксама творы графіка XVII стагоддзя Яна Зярнко, творчасць якога блізкая да польскага народнага лубачнага мастацтва, асноўныя ўзоры якога таксама прадстаўлены на выстаўцы.

Вобразы гісторыі польскага народа адлюстраваны ў творчасці майстроў іншых краін. Наведвальнікі выстаўкі знаёмяцца з выдатным манументальным партрэтам вядомага французскага мастака Луі Давіда, які напісаў Станіслава Коста Патоцкага. Гэты прыгожы і выразны партрэт — адзін з цудоўнейшых твораў французскага мастака. Англійскі жывапісец Рамзей Рычард Рэйнагль прадстаўлены партрэтам Тадэуша Касцюшкі.

Аўстрыйскі жывапісец Іаган Ламці стварыў маляўнічы партрэт Паўла Грабоўскага.

Польскае мастацтва было шчыльна звязана з перадавым мастацтвам іншых краін. У польскіх музеях захаваліся выдатныя ўзоры італьянскага, нямецкага, фламандскага, галандскага мастацтва. Глядач знаёміцца з серыяй малюнкаў Джавані Баста Т'еполо — майстра позняга італьянскага адраджэння, мініятурамі фламандскага жывапісца Брэйгеля малодшага, з серыяй твораў нідэрландскага жывапісу. Выстаўка сведчыць аб вялікіх мастацкіх багаццях польскіх музеяў. Усе гэтыя скарбы, выратаваныя Совецкай Арміяй і адноўленыя совецкімі мастацтвазнаўцамі і рэстаўратарамі, цяпер вернуты польскаму народу.

П. КАБЗАРЭЎСКІ.

Галоўны рэдактар Васіль ВІТКА.
Рэдакцыйная калегія: Заір АЗГУР, Дзмітрый АРЛОЎ, Уладзімір АЛОЎНІКАЎ, Алесь БАЧЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Ірына ЖДАНОВІЧ, Янка КАЗЕКА, Барыс ПЯРКОЎСКІ, Рыгор ШКРАБА.

АДРАС РЭДАКЦЫІ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефон 3-24-61.

АТ 08093. Друкарня імя Сталіна.